

## Апошні жыхар вёскі Немкавічы

СТАР. 6




## Чаму цяжка вярнуць грошы за сумнеўны тавар

СТАР. 7



## Беларускія кніжныя калекцыі... у Лондане

СТАР. 8

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый ВАРАНЕЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:**

*«Палітычны імідж краіны напрамую звязаны з інвестыцыйнай прывабнасцю. Калі ў дзяржавы вельмі добры імідж, ёсць аўтарытэт, то інвестар зверне позірк на гэтую краіну, потым будзе аналізаваць, якое тут заканадаўства, якія ёсць магчымасці. Беларусь — краіна з багатай гісторыяй, традыцыямі, велізарнымі магчымасцямі і патэнцыялам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8891 | ▼ |
| Еўра | 2,0111 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17030>

9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛЮТАГА 2017 г. АЎТОРАК № 30 (28394)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НОВАЯ ВЫШЫНЯ

## Дар'я Домрачава вярнулася на спартыўны Алімп




Фота БЕЛТА.

**Балельшчыкі, журналісты і трэнеры з трывогай чакалі пачатку сёлетняга чэмпіянату свету па біятлоне. Мы заўсёды спадзяёмся на добрае выступленне ўсёй беларускай зборнай, але перад стартам планетарнага першынства ў Хохфільцэне ў спартыўных колах лунала дадатковае пытанне: ці зможа прыма айчыннага біятлона вярнуцца на п'едэстал?**

Адказу ад Дар'і доўга чакаць не прыйшлося. У гонцы праследу адставанне ад лідара — чэшкі Габрыэлы Коукалавай складала практычна паўтары хвіліны, аднак аказалася, гэта не перашкода для нашай Дашы. Бліскуча прайшоўшы ўсе агнявыя рубяжы, на дыстанцыі беларуска праявіла былую моц і ў літаральным сэнсе ўварвалася на п'едэстал. Прайграўшы пераможцы ўсяго 11,6 секунды, Дар'я заваявала срэбраны медаль чэмпіянату і прадэманстравала самы ўражальны ўзлёт у пасьюце на чэмпіянатах свету за апошнія 17 гадоў.

**З высокім дасягненнем спартсменку павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.** *«Мы ўсе з нецярпеннем чакалі твайго вяртання на біятлонны Алімп, і ты апраўдала надзеі мільёнаў сваіх прыхільнікаў па ўсім свеце, прадэманстраваўшы яркае выступленне на трасе Хохфільцэна. Гэта вельмі важная перамога не толькі для цябе самой, але і для ўсяго беларускага спорту. Твае дасягненні — цудоўны прыклад спалучэння актыўнай жыццёвай пазіцыі з выдатнымі спартыўнымі вынікамі», — гаворыцца ў віншаванні.*

СТАР. 15

■ Лёсы

# Для шчасця неабавязкова мець рукі і ногі,

## або Як прага кахання зрабіла сапраўдны цуд

**34-гадовы аршанец Аляксей Талай, не зважаючы на адсутнасць ног і рук, шчаслівы чалавек. Ён — бацька траіх дзяцей. Больш за тое — паспяховы прадпрымальнік. Ён выступае з матывацыйнымі лекцыямі ў нашай краіне і за мяжой. Часта яго можна ўбачыць у папулярных тэлевізійных шоу. Выступленне Аляксея ў праграме Андрэя Малахава «Няхай гавораць» выклікала фурор: яго сустракалі стоячы і апладысментамі. Як і яго жонку, сваякоў, сяброў...**

### «Рэха вайны» змяніла жыццё

Яго нярэдка блытаюць з аўстралійцам Нікаласам Вуйчычам. Дарэчы, яны — равеснікі. Размовы, перапіска з Аляксеем не раз натхнялі іншых людзей. У яго нямала лістоў і электронных паведамленняў са словамі падзякі. У тым ліку і ад тых, хто хацеў скончыць жыццё самагубствам. Ён не ўтойвае, што часам і сам задумваўся, а ці варта жыць у такім становішчы. Такія думкі ўзнікалі пасля таго, як у 16 гадоў падарваўся на міне. Трагедыя адбылася ў вёсцы, дзе жыве яго дзядуля, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета дзядулі, у гонар якога назвалі Лёшу, споўніцца 90!

СТАР. 5

